*С. М. Недабой*
(Мінск)

# Дзейнасць Дзяржаўнага мастацкага музея БССР па папулярызацыі мастацтва сярод школьнікаў і навучэнцаў у 1950–1980 гг.

Дзяржаўны мастацкі музей БССР заўсёды надаваў значную ўвагу папулярызацыі выяўленчага мастацтва сярод падрастаючага пакалення. Вялікая колькасць мерапрыемстваў арганізоўвалася спецыяльна для школьнікаў у 1950–1980 гг. Музей актыўна выкарыстоўваў разнастайныя формы і метады музейна-педагагічнай дзейнасці: ад класічных экскурсій і лекцый да мастацтвазнаўчых гурткоў і спецыялізаваных музейна-педагагічных праграм. Асобныя праграмы былі распрацаваны і для педагогаў сярэдніх спецыяльных школ.

У мэтах папулярызацыі мастацтва сярод школьнікаў аддзел прапаганды музея, напрыклад, у 1959 г. 17 разоў праводзіў спецыялізаваныя піянерскія зборы, прысвечаныя выяўленчаму мастацтву. Аднак падрабязная дакументацыя (сцэнарыі, планы і справаздачы, метадычныя распрацоўкі) пра прыгаданыя мерапрыемствы сярод дакументаў архіўнага фонду музея не захавалася. Больш таго, у выніковай справаздачы за 1959 г. не ўказана нават колькасць школьнікаў, якія наведалі музей за вызначаны перыяд [1, арк. 20].

На працягу таго ж 1959 г. аддзел прапаганды Дзяржаўнага мастацкага музея БССР сумесна з гарадскім аддзелам адукацыі і гаркамам камсамола правялі шэраг нарад, прысвечаных выхаваўчай рабоце са школьнікамі, узмацненню сярод іх работы па эстэтычным выхаванні. Адпаведныя нарады былі праведзены таксама са старшымі піянерважатымі, кіраўнікамі камсамольскіх арганізацый, дырэктарамі школ.

У гэты ж перыяд музей выдае лістоўкі, у якіх распрацаваны экскурсіі для розных груп школьнікаў. Да пачатку 1959/60 навучальнага года ў музеі быў распрацаваны новы цыкл экскурсій і лекцый для школьнікаў рознага ўзросту. А з верасня 1959 г. пачаў дзейнічаць гурток юных мастацтвазнаўцаў (ГЮМ) [1, арк. 1].

На працягу 1960–70-х гг. Дзяржаўны мастацкі музей БССР працягваў актыўныя заняткі са школьнікамі. Музей па традыцыі праводзіў для іх экскурсіі, лекцыі, тэматычныя заняткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У дакументацыі музея пазначаюцца школы, якія часцей за іншых наведвалі мерапрыемствы музея. У той жа час прыгадваюцца і такія, якія ні разу за год не прыводзілі сваіх вучняў у музей. Акрамя таго, у школах г. Мінска экспанаваліся перасоўныя выставы. Асобныя экскурсіі і лекцыі праводзіліся для настаўнікаў.

З 1960-х гг. у дакументах пастаянна згадваецца работа гурткоў юных мастацтвазнаўцаў. Гурткі працавалі на базе музея, у школах, школах-інтэрнатах, пры мастацкіх студыях. Гэтыя гурткі праводзілі такія спецыялісты, як Н. Ф. Высоцкая, Т. А. Рэзнік, Т. А. Карповіч, Р. Г. Бадзін, Э. Г. Казлова, М. А. Шчарбакова і інш. Так, толькі за першы квартал 1964 г. супрацоўнікі музея правялі чатыры заняткі гуртка юных мастацтвазнаўцаў з вучнямі СШ № 90 г. Мінска [3, арк. 153].

У 1969 г. працягваў работу гурток юных мастацтвазнаўцаў пад кіраўніцтвам Н. Ф. Высоцкай (15 заняткаў), арганізоўваліся перасоўныя выставы. У СШ № 61 і 62 экспанавалася перасоўная выстава «Вобраз У. І. Леніна ў выяўленчым мастацтве».

Работа са школьнікамі ў вызначаным кірунку працягвалася і ў наступныя гады. Ступень сур’ёзнасці і зацікаўленасці кіраўніцтва музея ў папулярызацыі мастацтва сярод вучняў добра бачна ў матэрыялах 1974 г. У музеі для школьнікаў сістэматычна працаваў лекторый для школьнікаў 5–10 класаў, тэматыка лекцый была звязана са школьнай праграмай па літаратуры і гісторыі. Па ініцыятыве школ арганізаваны факультатыўныя заняткі ў лекторыі музея, іх наведвалі вучні сярэдніх школ № 103 (8 кл.) і № 40 (6–7 кл.). Для таго каб школьнікі маглі атрымаць сістэматычныя веды па мастацтве, практыкавалася правядзенне тэматычных экскурсій па залах музея. Для вучняў 5–7-х класаў былі арганізаваны заняткі на тэму «Як робіцца скульптура» ў скульптурнай майстэрні музея.

У музеі на працягу 1973/74 навучальнага года працавалі тры гурткі для школьнікаў 8-га, 9-га, 10-га класаў. Усяго было праведзена 54 заняткі [4, арк. 4]. Гуртжоўцы слухалі лекцыі, знаёміліся з работай розных аддзелаў музея (рэстаўрацыйнымі майстэрнямі, фондамі, формамі навуковай працы), рыхтавалі самастойныя працы па аналізе твораў, якія экспанаваліся ў залах музея, рэгулярна з кіраўнікамі гурткоў (навуковымі супрацоўнікамі музея) наведвалі мастацкія выставы, сустракаліся з беларускімі мастакамі ў майстэрнях. Такія сустрэчы ў майстэрнях праводзілі З. І. Азгур, М. В. Данцыг, Г. Г. Паплаўскі, В. Г. Гаўрылаў. Тэмы заняткаў у майстэрнях былі звязаны з відамі і жанрамі мастацтва,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыяй сусветнага і айчыннага мастацтва. Найбольш папулярныя тэмы заняткаў у гуртках – «Шэдэўры сусветнага мастацтва», «Архітэктура як від мастацтва», «Як правільна глядзець на карціны». Як правіла, у гуртку юных мастацтвазнаўцаў склад слухачоў захоўваўся на працягу трох гадоў. Штогод музей аб’яўляў набор у гэты гурток для школьнікаў восьмых класаў.

У лістападзе 1974 г. кіраўніцтва музея падрыхтавала для ЦК КПБ службовы допіс «Аб рабоце музея са школьнікамі» за подпісам намесніка дырэктара І. Н. Паншынай. Для таго каб мерапрыемствы музея па эстэтычным выхаванні школьнікаў былі найбольш дзейснымі, Дзяржаўны мастацкі музей БССР прапаноўваў у планы работы па патрыятычным выхаванні школьнікаў уключаць абавязковае наведванне мастацкага музея; у сістэму павышэння кваліфікацыі настаўнікаў літаратуры і гісторыі ўключаць сістэматычныя заняткі ў лекторыі музея (у першым паўгоддзі 1974 г. у музеі для настаўнікаў былі праведзены 10 экскурсій і прачытаны 4 лекцыі). Выказвалася пажаданне Міністэрству асветы давесці да ведама настаўнікаў літаратуры, гісторыі, малявання і класных кіраўнікоў планы работы музея са школьнікамі (музей па сваёй ініцыятыве рассылаў буклеты «У дапамогу школе» па ўсіх школах горада). Супрацоўнікі музея лічылі, што наведванне музея не павінна быць разавым наведваннем вучнямі аднаго класа на працягу года, а сістэматычным праслухоўваннем школьнікамі цыкла лекцый або правядзеннем цыкла экскурсій, прапаноўвалася адвесці ў школе для гэтых заняткаў спецыяльныя гадзіны [4, арк. 26]. Пры гэтым работнікі аддзела прапаганды адзначалі, што значна знізілася экскурсійнае наведванне музея школьнікамі пасля ўвядзення аплаты за экскурсійнае абслугоўванне. Супрацоўнікі музея лічылі неабходным адмяніць у музеях аплату за экскурсійнае абслугоўванне школьнікаў, зрабіць для школьнікаў наведванне музея бясплатным. Такая прапанова вынікала з зацікаўленасці ў пашырэнні ведаў вучняў у галіне мастацтва, гісторыі, літаратуры, уплывала на патрыятычнае і эстэтычнае выхаванне падрастаючага пакалення
[4, арк. 27].

У 1984 г. музеем былі заключаны дагаворы на наведванне музея навучальнымі ўстановамі. Прыкладна ў гэты ж час вопыт работы гурткоў юных мастацтвазнаўцаў быў пашыраны і на створаныя філіялы музея. У выніку гэтага ў Крынічанскай СШ Мазырскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раёна на працягу года былі праведзены 43 заняткі; у Мазырскай СШ № 7 у гуртку аматараў мастацтваў для вучняў 5–7 класаў праведзена 8 заняткаў; у мастацкай студыі г. Магілёва мастацкім музеем В. К. Бялыніцкага-Бірулі быў створаны гурток мастацтвазнаўцаў, а ў СШ № 3 г. Магілёва дзейнічаў клуб «Жывапіс, паэзія, музыка» [2, арк. 15].

Падводзячы высновы, можна канстатаваць, што асноўныя кірункі культурна-адукацыйнай дзейнасці музея са школьнікамі і моладдзю вызначыліся яшчэ ў савецкі час.


1. *Беларускі* дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). – Ф. 164 «Дзяржаўны мастацкі музей БССР». – Воп. 1. – Спр. 83.

2. Там жа. Спр.127.

3. Там жа. Спр.135.

4. Там жа. Спр.217.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ